# Да 60-годдзя БДУ імя У. І. Леніна

В. П. РАГОЙША

## НАБЫТКІ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЙ ДУМКІ (1970—1980)

Літаратуразнаўчая навука ў БДУ імя У. І. Леніна мае свае даўнія традыцыі. У даваенныя і першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ў рэчышча гэтых традыцый уліліся творчыя здабыткі такіх буйных вучоных, як прафесары І. І. Замоцін (1874—1942), Я. І. Барычэўскі (1883—1934), А. М. Вазнясенскі (1888—1966), М. Я. Піятуховіч (1891—1937), І. В. Гутараў (1906—1967). Значны ўклад у развіццё навукі пра літаратуру ўнеслі вучоныя-філолагі ў апошнія дзесяць гадоў: прафесары С. Х. Александровіч, Н. С. Гілевіч, Ф. І. Куляшоў, М. Р. Ларчанка, А. А. Лойка, І. Я. Навуменка, Л. І. Фіглоўская, дацэнты Д. Я. Бугаёў, Н. В. Галаўко, В. А. Захарава, В. В. Казлова, У. С. Карабан, Л. Л. Кароткая, І. П. Кахно, Б. П. Міцкевіч, П. І. Ткачоў, В. М. Цімафеева, М. Б. Яфімава і інш.

У 70-я гады на чатырох літаратуразнаўчых кафедрах—беларускай літаратуры, рускай класічнай літаратуры, рускай савецкай літаратуры, зарубежнай літаратуры — працавала 60 выкладчыкаў, у тым ліку 6 дактароў і 36 кандыдатаў навук. Вырасла кагорта маладых вучоных, у пару творчай сталасці ўвайшлі прадстаўнікі сярэдняга пакалення універсітэцкіх выкладчыкаў. Дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук абаранілі С. Х. Александровіч («Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX—пачатку XX стагоддзяў», 1971) і П. І. Ткачоў («Памфлет і яго формы. Тэарэтычныя праблемы, гістарычны вопыт, сучасная практыка», 1980). Кандыдатамі філалагічных навук сталі С. Н. Чубакоў («Праблема вайны і міру ў творчасці Л. М. Талстога», 1970), І. С. Скарапанава («Ідэйна-мастацкія пошукі М. А. Булгакава. 20-я гг.», 1972), А. А. Станюта («Ідэя чалавека ў творчасці Ф. М. Дастаеўскага. 1840-я—1860-я гг.», 1973), У. А. Навумовіч («Проза «Маладняка», 1974), А. В. Сокалава («Асаблівасці рэалізму Буніна-празаіка дакастрычніцкага перыяду», 1975), Т. І. Шамякіна («Асноўныя стылявыя напрамкі сучаснай беларускай прозы», 1975), Г. Л. Нягіна («Руская савецкая аповесць 60-х—70-х гадоў. Драматызацыя жанра», 1979), Л. К. Тарасюк («Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі», 1980). Ва універсітэцкім, рэспубліканскім і саюзным друку з'явіліся даследаванні універсітэцкіх вучоных, якія ўзбагацілі не толькі беларускую, але і ўсесаюзную навуку пра літаратуру.

Спецыфіка навуковай працы выкладчыка—выразная арыентаванасць яе на вучэбны працэс. Менавіта таму значную частку навуковай прадукцыі універсітэцкіх літаратуразнаўцаў складаюць выданні, звязаныя з выкладаннем літаратуры. Патрэбамі вучэбнага працэсу вытлумачваецца і выхад у свет цэлага шэрагу хрэстаматый, анталогій, зборнікаў, укладзеных літаратуразнаўцамі БДУ і, як правіла, рэкамендаваных у якасці вучэбных дапаможнікаў. На высокім навуковым і метадычным узроўні выдадзены «Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя», 1971 (уклалі С. Х. Александровіч, А. А. Лойка, В. П. Рагойша); «Песні сямі вёсак. Традыцыйная народная лірыка Мінішчыны», 1973 (Н. С. Гілевіч); «Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры», 1973

(В. А. Захарава); «Хрестоматия по введению в литературоведение» (Выд. 2-е, 1973 (У. С. Карабан, Л. Л. Кароткая); «Лірычныя песні. Беларускі фальклор у сучасных запісах», 1976 (Н. С. Гілевіч); «Беларуская народная творчасць савецкага часу», 1978 (В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Літвінка, Р. І. Ярслаўцава); «Беларуская літаратура XIX — пачатку XX стагоддзяў. Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў», 1978 (С. Х. Александровіч, В. С. Александровіч); «Древняя русская литература в исследованиях. Хрестоматия», 1979 (Л. М. Гусева, Л. Л. Кароткая); «Лірыка беларускага вяселля», 1979 (Н. С. Гілевіч). І. В. Зазека сабраў, сістэматызаваў і выдаў паэтычныя творы беларускіх партызан перыяду Вялікай Айчыннай вайны («Лясныя песні». Выд. 2-е, 1974). А А. Лойка, які шмат гадоў з'яўляецца кіраўніком універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт», у 70-я гады падрыхтаваў дзве новыя кнігі вершаў універсітэцкіх паэтаў «Універсітэт паэтычны» (1971) і «Вёсны» (1977); да гэтага былі выдадзены кнігі «Узлёт» (1965), «Натхненне» (1967). Асобныя выданні выбраных твораў вядомых рускіх і беларускіх пісьменнікаў уклалі С. Х. Александровіч, Д. Я. Бугаёў, Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, П. І. Ткачоў, Ф. І. Куляшоў і інш. Прычым, ва ўсіх такіх выданнях пяру ўкладальнікаў належаць таксама грунтоўныя уступныя артыкулы (або пасляслоўі), разгорнутыя каментарыі да змешчаных твораў.

Нямала часу універсітэцкія вучоныя аддаюць навуковаму рэдагаванню. Так, пад агульнай рэдакцыяй М. Р. Ларчанкі (і пры яго сааўтарстве) выйшаў грунтоўны вучэбны дапаможнік «Беларуская народна-паэтычная творчасць» (1979). М. Б. Яфімава з'яўляецца сааўтарам і навуковым рэдактарам вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура» (Выд. 2-е, 1980). Д .Я. Бугаёў — нязменны рэдактар рэспубліканскіх перыядычных зборнікаў лепшых літаратурна-крытычных артыкулаў «На арбіце часу» і «На высокай хвалі». Навукова-рэдактарскую работу актыўна вядуць Ф. І. Куляшоў, А. А. Лойка, П. І. Ткачоў, Б. П. Міцкевіч і інш.

Несумненна, адзін з найбольш цяжкіх і адказных жанраў літаратуразнаўства — падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для вышэйшых навучальных устаноў, якія б спалучалі навейшыя дасягненні літаратуразнаўчай думкі з метадычна рацыянальнай формай выкладу матэрыялу. Універсітэцкімі літаратуразнаўцамі створаны шэраг такіх вучэбных дапаможнікаў. Імі зараз карыстаюцца студэнты не толькі БДУ імя У. І. Леніна, але і іншых універсітэтаў і педінстытутаў рэспублікі і ўсёй краіны. Гэта адносіцца, у прыватнасці, да «Лекций по истории русской литературы конца XIX — начала XX вв.» (Том 1 — 1976; Том 2 — 1980) Ф. І. Куляшова, у якіх па-навуковаму глыбока, арыгінальна прааналізаваны літаратурны працэс Расіі некалькіх перадрэвалюцыйных дзесяцігоддзяў, дадзена грунтоўная характарыстыка творчасці буйнейшых пісьменнікаў і літаратурных плыняў. Супрацоўнікі кафедры зарубежнай літаратуры Н. І. Лапідус, Б. П. Міцкевіч, В. М. Цімафеева і І. В. Шаблоўская напісалі вучэбны дапаможнік «Зарубежная литература» (Выд. 2-е, 1973), у якім ахарактарызаваны важнейшыя гісторыка-літаратурныя з'явы да 1917 года, разгледжана творчасць майстроў сусветнай літаратуры, пачынаючы з эпохі антычнасці і да пачатку XX стагоддзя. Працягам гэтага выдання з'яўляецца вучэбны дапаможнік В. М. Цімафеевай і Б. П. Міцкевіча «Зарубежная література. 1917 — 1975» (1976), адрасаваны студэнтам вячэрніх і завочных аддзяленняў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў. В. М. Цімафеева выдала вучэбны дапаможнік «Литература европейских социалистических стран» (1979), у якім упершыню абагульнены і сістэматызаваны вялікі фактычны матэрыял з гісторыі еўрапейскіх літаратур краін сацыялістычнай садружнасці. А. А. Лойка стварыў капітальную «Гісторыю беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд» (Частка 1 — 1977; Частка 2 — 1980), якая не мае прэцэдэнта ва ўсім беларускім літаратуразнаўстве. Напісаная ў адпаведнасці з універсітэцкай праграмай па гісторыі беларускай літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзяў, праца А. А. Лойкі дае ў многім новы погляд на літаратурныя з'явы, уводзіць у навуковы абыходак шэраг невядомых раней фактаў, удакладняе перыядызацыю гісторыка-літаратурнага працэсу. Яна вызначаецца навуковай канцэптуальнасцю, напісана даходліва, жывой, вобразнай мовай. Пад рэдакцыяй прафесара А. Я. Супруна ўпершыню ў краіне выйшаў вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў вну па новаму прадмету — «Введение в специальность» (1977). Некалькі раздзелаў у дапаможніку адведзена літаратуразнаўчым праблемам (аўтар — В. П. Рагойша).

Літаратуразнаўчыя кафедры універсітэта таксама ўносяць адчувальны ўклад у распрацоўку праблем гісторыі беларускай, рускай і замежнай літаратур, міжлітаратурных узаемасувязей, тэорыі літаратуры і народнай вусна-паэтычнай творчасці. Асабліва шырока вядзецца ў БДУ вывучэнне разнастайных аспектаў гісторыі беларускай літаратуры. Дакастрычніцкаму перыяду яе развіцця прысвечаны грунтоўныя даследаванні Л. А. Царанкова «Францыск Скарына і яго час» (1975), С. Х. Александровіча «Пуцявіны роднага слова. Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX — пачатку XX ст.» (1971), Р. М. Семашкевіча «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе. Канец XIX — пачатак XX ст.» (1971), А. А. Лойкі «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. Некаторыя заканамернасці і асаблівасці» (1972), М. Р. Ларчанкі «Жывая спадчына» (1977), К. Р. Хромчанкі «Беларуская мастацкая проза. Канец XIX — пачатак XX ст.» (1979). Надзвычай інтэнсіўна распрацоўваліся ў 1970 — 1980-х гадах пытанні развіцця беларускай савецкай літаратуры. У цэлым шэрагу грунтоўных выданняў аналізуецца творчасць буйнейшых прадстаўнікоў нацыянальнай прозы і паэзіі: Я. Купалы і Я. Коласа (зборнік «Народныя песняры», 1972, складзены з артыкулаў М. Р. Ларчанкі, І. Я. Навуменкі, А. А. Лойкі, В .В. Казловай, Л. І. Фіглоўскай, С. Х. Александровіча, Н. С. Гілевіча, Д. Я. Бугаёва, В. П. Рагойшы і інш.), К. Крапівы (Д. Я. Бугаёў «Зброяй сатыры, зброяй праўды», 1971), І. Мележа (Ф. И. Кулешов «Иван Мележ» — М., 1971; Д. Я. Бугаёў «Вернасць прызванню. Творчая індывідуальнасць І. Мележа», 1977), М. Лынькова (Ф. І. Куляшоў «Міхась Лынькоў. Жыццё і творчасць». Выд. 2-е, 1974; Яго ж «Міхась Лынькоў. Нарыс жыцця і творчасці», 1979). Асаблівасці сучаснага літаратурнага працэсу Беларусі вызначылі асноўны змест зборнікаў выбраных літаратурна-крытычных артыкулаў Д. Я. Бугаёва «Шматграннасць» (1970) і «Талент і праца» (1979), С. Х. Александровіча «Кнігі і людзі» (1976), Н. С. Гілевіча «У гэта веру» (1978), А. А. Лойкі «Паэзія і час» (1980).

Не забываюцца літаратуразнаўцы і пра сярэднюю школу. Л. А. Царанкоў і С. Х. Александровіч (у сааўтарстве) ўклалі хрэстаматыі па роднай літаратуры для 7-га і 8-га класаў сярэдняй школы, якія вытрымалі больш дзесяці выданняў. Вучням адрасавана і кніга нарысаў пра беларускіх пісьменнікаў С. Х. Александровіча «Тут зямля такая» (1974); М. Б. Яфімава выдала надзвычай патрэбны метадычны дапаможнік «Літаратурныя вечары ў школе» (1977). У кнізе В. П. Рагойшы «Гутаркі пра верш. Метрыка. Рытміка. Фоніка» (1979), выдадзенай у падпісной «Бібліятэцы настаўніка беларускай мовы і літаратуры», вядзецца гаворка пра розныя аспекты гісторыі і тэорыі беларускага верша.

Значныя здабыткі маюць і літаратуразнаўцы-русісты. Пільную ўвагу звяртаюць яны на рускую класічную літаратуру. У манаграфіі Л. Л. Кароткай «На путях к атеизму» (1971) грунтоўна даследуюццца антыцаркоўныя традыцыі ў старажытнарускай літаратуры. Дзве працы Н. В. Галаўко — «Литературно-эстетические взгляды поэтов «Искры» (1972) і «Русская критика в борьбе за реализм (А. Н. Плещеев, М. Л. Михайлов)» (1980) — прысвечаны высвятленню некаторых заканамернасцей развіцця рускай крытыкі другой паловы XIX стагоддзя. Праблема антываеннай традыцыі ў рускай класічнай літаратуры лягла ў аснову трох даследаванняў С. Н. Чубакова — «Лев Толстой о войне и милитаризме» (1973), «Слово и оружие» (1975) и «Все дело жизни (Лев Толстой и поиски мира)» (1978). Глыбокае манаграфічнае даследаванне творчасці аўтара «Вайны і міру» — «Л. Н. Толстой. Из лекций по русской литературе XIX в.» (1978) — выдаў Ф. І. Куляшоў. Універсітэцкія літаратуразнаўцы ўнеслі свой ўклад і ў вывучэнне спадчыны Ф. М. Дастаеўскага (А. А. Станюта «Идея человека в творчестве Ф. М. Достоевского (1840 — 1860 гг.)», 1973; Яго ж «Постижение человека», 1976) і М. Я. Салтыкова-Шчадрына (зб. «Творчество М. Е. Салтыкова-Щедрина», 1975). І. П. Кахно даўно цікавяць літаратурнакрытычная і мастацкая творчасць першага савецкага наркома асветы А. В. Луначарскага. У савецкіх і замежных архівах даследчык выявіў шэраг невядомых дакументальных матэрыялаў, паасобныя публікацыі яго твораў. Вынікам шматгадовых даследаванняў сталі дзве манаграфіі І. П. Кахно: «Черты портрета. Страницы жизни и деятельности А. В. Луначарского (1972), «А. В. Луначарский и формирование марксистской литературной критики» (1979). Рускай літаратуры савецкага перыяду прысвечаны манаграфія Н. М. Рамашкі «Традиции и

современность» (1974), а таксама падрыхтаваныя супрацоўнікамі кафедры рускай савецкай літаратуры чатыры зборнікі артыкулаў — «Литература и время» (1970), «Ленин и художественная литература» (1971), «Великий Октябрь и художественная литература» (1977), «Современные проблемы советской литературы» (1980). У артыкулах, напісаных вучонымі як старэйшага, так і малодшага пакаленняў, узнімаюцца разнастайныя пытанні развіцця савецкай літаратуры: руская літаратурная Ленініяна, народнасць і партыйнасць мастацкай літаратуры, маральна-філасофскія пошукі ў сучаснай прозе, жанравая і стылявая шматстайнасць сучаснай паэзіі і прозы, савецкая літаратура за мяжой і інш.

Адной з самых актуальных праблем сучаснага літаратуразнаўства з'яўляецца даследаванне міжлітаратурнага ўзаемадзеяння. Традыцыі такіх даследаванняў яшчэ ў першыя пасляваенныя гады заклаў прафесар універсітэта М. Р. Ларчанка (гл. яго: «А. М. Горкі і беларуская літаратура», 1951; «Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры», 1951; «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX стагоддзя», 1958; «Славянская супольнасць», 1963 і інш). Новая манаграфія М. Р. Ларчанкі «Яднанне братніх літаратур» (1974) прысвечана вывучэнню найбольш важных пытанняў узаемадзеяння беларускай літаратуры з рускай, украінскай, польскай, чэшскай, балгарскай, літаратурамі Югаславіі. Зусім невядомую старонку ў гісторыі беларуска-польскіх літаратурных і грамадска-палітычных сувязей XIX стагоддзя адкрыў сваёй эўрыстычнай працай «Вальнадумец з-пад Нясвіжа Аляксандр Незабытоўскі» (1975) С. Х. Александровіч, для якога вывучэнне беларуска-рускіх, беларуска-украінскіх, беларуска-польскіх літаратурных сувязей з'яўляецца справай усяго жыцця. У манаграфіі Т. В. Кабржыцкай і В. П. Рагойшы «Карані дружбы» (1976) прасочаны заканамернасці ўзнікнення і развіцця беларуска-украінскіх літаратурных сувязей пачатку XX стагоддзя. Кніга літаратурна-крытычных эцюдаў Н. С. Гілевіча «Верная вялікім запаветам» (1977) з'явілася першай ва ўсім савецкім літаратуразнаўстве працай пра асаблівасці сучаснай (1956—1976) балгарскай паэзіі. Яго ж брашура «Вусная народная творчасць і сучасная лірычная паэзія ўсходніх і паўднёвых славян», выдадзеная да 8-га Міжнароднага з'езда славістаў (1978), абагульніла назіранні над многімі тыпалагічна падобнымі з'явамі ў паэзіі (вуснай і пісьмовай) большасці славянскіх народаў. Найбольш дзейсная форма міжлітаратурнага ўзаемадзеяння — мастацкі пераклад. У кнізе В. П. Рагойшы «І нясе яна дар...» (1977) аналізуецца працэс узнаўлення беларускай паэзіі сродкамі рускай і ўкраінскай моў. Тэарэтычныя аспекты беларуска-руска-украінскага паэтычнага ўзаемаперакладу ляглі ў аснову яго манаграфіі «Проблемы перевода с близкородственных языков» (1980).

Тэорыя літаратуры ў БДУ імя У. І. Леніна развівалася ў апошняе дзесяцігоддзе, галоўным чынам, у трох напрамках: разглядаліся асаблівасці формы некаторых фальклорных жанраў; вывучалася спецыфіка памфлета і яго формаў; даследавалася паэтыка верша. Тэарэтычнае даследаванне фальклору ў значнай ступені стымулявалася падрыхтоўкай да выдання шматлікіх запісаў сучаснай вуснай народнай творчасці, сабранай і апрацаванай студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў. У 70-я гады Н. С. Гілевіч выдаў тры манаграфіі па гісторыі і тэорыі беларускага фальклору — «З клопатам пра песні народа» (1970), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма» (1975) і «Паэтыка беларускіх загадак» (1976). У манаграфіях упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве сістэматызаваны і прааналізаваны асобныя кампаненты паэтыкі народных песень і загадак, вызначаны іх мастацкія функцыі. Асаблівасці народнай творчасці даследуюцца і ў кнізе В. А. Захаравай і В. В. Равіцкага «З жыватворных крыніц» (1970). Розныя ўзроўні паэтыкі літаратурнага і народнага верша апісаны ў «Паэтычным слоўніку» (1979) В. П. Рагойшы. Сярод іх — лексіка паэтычная, тропы, рытміка, інтанацыя, паэтычны сінтаксіс, фоніка, рыфма, кампазіцыя, строфіка, асобныя віды верша і паэтычныя жанры. Значную вядомасць у рэспубліцы і за яе межамі набылі працы П. І. Ткачова, прысвечаныя разгляду гістарычных і тэарэтычных праблем памфлетнай творчасці. Яго манаграфіі «Иду на «вы». Заметки о памфлете» (1975), «Границы жанра» (1977) і «Сатиры злой звенящая строка. Природа смеха в памфлете» (1980) раскрываюць сутнасць памфлета як жанра, выяўляюць своеасаблівасць гэтага жанра, гістарычныя заканамернасці яго ўзнікнення і развіцця ў сусветнай літаратуры.

Такія асноўныя дасягненні літаратуразнаўцаў БДУ імя У. І. Леніна ў 1970—1980 гады. Вядома, засталося яшчэ нямала нявырашаных пытанняў. Аднак тое, што зроблена, што дасягнута,— надзейная запарука далейшых поспехаў універсітэцкіх вучоных—гісторыкаў, тэарэтыкаў і крытыкаў мастацкай літаратуры.

І. К. ГЕРМАНОВІЧ

## РАЗВІЦЦЁ МОВАЗНАЎСТВА Ў БДУ

Беларускі дзяржаўны універсітэт з першых гадоў існавання заявіў аб сабе не толькі як вядучая вышэйшая навучальная ўстанова рэспублікі, але і як буйны даследчы цэнтр. У ім разам з іншымі галінамі ведаў адразу ж пачынае паспяхова развівацца і мовазнаўства. Нягледзячы на адсутнасць дастатковай колькасці спецыялістаў, ужо ў 20-х гадах ва універсітэце былі створаны цікавыя лінгвістычныя працы, якія на той час мелі вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Рад каштоўных артыкулаў, прысвечаных розным пытанням гісторыі і дыялекталогіі беларускай мовы, апублікаваў І. В. Воўк-Левановіч. Высокую ацэнку спецыялістаў атрымалі выдадзеныя ім у 1927 годзе на рататары «Лекцыі па гісторыі беларускай мовы». У іх аўтар сістэматычна выклаў першую частку (уступ і фанетыку) праграмнага універсітэцкага курса, чытанага на працягу 1925—1927 гадоў студэнтам этнолага-лінгвістычнага аддзялення педфака. «Лекцыі па гісторыі беларускай мовы» былі ўхвалены галоўным метадычным кабінетам пры Народным камісарыяце асветы БССР як вучэбны дапаможнік для вышэйшых навучальных устаноў і педагагічных тэхнікумаў.

Пад час работы ў Белдзяржуніверсітэце звыш 60 мовазнаўчых даследаванняў апублікаваў П. А. Бузук. З іх асаблівай увагі заслугоўвае выдадзеная пад грыфам Інстытута беларускай культуры манаграфічная праца «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі. Частка І. Фанетыка і марфалогія. Вып. І. Гаворкі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі і суседніх мясцовасцей Украіны і Вялікарасіі ў першай чвэрці XX в.» (1928). Гэта першы ў славянскім мовазнаўстве дыялекталагічны атлас. Ён складаецца з 20 лінгвістычных карт і 111 старонак каментарыяў да іх. На картах паказаны межы тэрытарыяльнага пашырэння найбольш яркіх фанетычных і марфалагічных асаблівасцей беларускай народнай мовы: відаў акання, замены «а» на «о» перад «ў», пераходу «л» у «ў»; форм назоўнага склону назоўнікаў мужчынскага роду множнага ліку тыпу «ваўке», «лясэ», форм назоўнікаў творнага склону множнага ліку з аднаскладовым канчаткам тыпу «рукам», «нагам» і інш.

Нельга не адзначыць і вучэбнага дапаможніка для настаўнікаў беларускай мовы і студэнтаў лінгвістычных аддзяленняў «Асноўныя пытанні мовазнаўства» (1926), створанага П. А. Бузуком на базе яго ранейшай працы «Основные вопросы языкознания» (М., 1924). У дапаможніку даступна выкладзены такія пытанні, як прырода слова і яго ўтварэнне ў чалавечай псіхіцы, паходжанне і развіццё мовы, гукі чалавечай мовы, гукавыя змены і іх прычыны, семасіялогія, граматыка, галоўныя прынцыпы граматычнага развіцця, задачы параўнальнага мовазнаўства.

Арыгінальным для свайго часу быў падручнік для тэхнікумаў і самаадукацыі А. В. Багдановіча «Беларуская мова (1926). Ад іншых тагачасных падручнікаў—практычных граматык—ён адрозніваўся як зместам, так і будовай. Гэта быў своеасаблівы тэарэтычны курс сучаснай беларускай мовы з элементамі яе гісторыі, параўнальнага і агульнага мовазнаўства. Агульнаму мовазнаўству прысвечана ўся першая частка падручніка—«Уводзіны». Яна складаецца з трох раздзелаў «Папярэднія звесткі аб мове», «Фізіялогія гукаў мовы», «Сем'і і тыпы моў». У апошнім раздзеле пасля разгляду тыпалагічнай і генеалагічнай класіфікацый жывых і мёртвых моў свету аўтар робіць лагічны пераход да беларускай, уключыўшы такія параграфы, як «Славянская галіна і месца беларускай мовы ў яе коле», «Этнаграфічныя межы беларускай мовы і яе падмовы і гаворкі», «Літаратурная беларуская мова і яе адносіны да паасобных дыялектаў». Другая частка гэтага падручніка складаецца з шасці раздзелаў. У першым раздзеле прасочваецца працэс складвання і паступовага развіцця беларускай мовы з самай старажытнай пары да 1917 года, характарызуецца лёс і становішча яе ў розныя гістарычныя пе-